Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»
Кафедра славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі
Кафедра гісторыі Беларусі

# БЕЛАРУСЬ У ЭПОХУ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ УЗРУШЭННЯЎ:

## *Да 100-годдзя выхаду ў свет газеты «Наша ніва»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі*

г. Мінск, 10 лістапада 2006 г.

Мінск 2006

патрыётам Бацькаўшчыны В.Ю. Ластоўскім. Яе выданне стала першым вопытам стварэння вучэбнага дапаможніка па айчыннай гісторыі і, у гэтым сэнсе, можа разглядацца ў якасці фундамента, на якім пачалося стварэнне нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі.

*Літаратура*


1. Нарысы па гісторыі Беларусі: У 2 т. / пад рэд. М. В. Біча. Мн., 1994. Т. 1.
2. Ліндэр Р. Гісторыя і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX стст. СПб., 2003.
3. БДАМЛіМ, ф. 3, в. 1, с. 78.
4. БДАМЛіМ, ф. 3, в. 1, с. 87.
5. Ластоўскі В. Ю. Кароткая гісторыя Беларусі. Мн., 1992.
6. Власт. Кароткая гісторыя Беларусі з 40 рысункамі. Вільня, 1910.
7. Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1991.


## АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ГАЗЕТЫ "НАША НІВА"


А.І.Багдановіч, І.І.Багдановіч г. Мінск, БДПУ


Выданне "Нашай нівы" – гэта гістарычная з'ява ў жыцці беларускага народа, значэнне якой нельга недаацэньваць. Яна, у пэўным сэнсе, мела лёсавызначальнае значэнне для станаўлення нацыянальнай свядомасці і фарміравання беларускай нацыі. Выданне газеты стала магчымым, дзякуючы дэмакратызацыі расійскага грамадства ў час рэвалюцыі 1905-1907г.г. Нягледзячы на складаныя ідэалагічныя і палітычныя ўмовы перыяду паслярэвалюцыйнай рэакцыі, у якіх выдавалася газета, рэдкалегія паслядоўна праводзіла сваю рэдакцыйную палітыку на фарміраванне нацыянальнай свядомасці беларусаў. Цэнтральнае месца ў гэтай палітыцы займала культурна-асветніцкая дзейнасць, бо весці адкрытую крытыку нацыянальнай палітыкі царызму ва ўмовах жорсткай цэнзуры было немагчыма.

Даследаванню дзейнасці газеты "Наша ніва" прысвечаны сотні публікацый і нават дысертацыйных даследаванняў, праўда большасць з іх належыць філолагам. Гісторыкі пачалі інтэнсіўна даследваць дзейнасць "Нашай нівы" толькі ў 90-я гады, што абумоўлена ідэалагічнымі ўмовамі савецкага часу. Сярод найбольш грунтоўных даследчыкаў дзейнасці газеты "Наша ніва" можна назваць Біча М.В. [1], Лыча Л.М. [2], Ліндэра Р. [3], Смалянчука А. [4], Сташкевіча М.С. [5], Сідарэвіча А. [6]. Асобна трэба сказаць аб кандыдацкай дысертацыі Унучака А.У. [7], якая стала першай гістарычнай навукова – даследчай працай, спецыяльна прысвечанай дзейнасці газеты. Разам з тым, нельга сказаць аб тым, што ў гістарычным плане шматгранная дзейнасць газеты


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

грунтоўна даследавана, многія аспекты яе дзейнасці застаюцца не разгледжанымі і патрабуюць далейшага вывучэння.

Прадстаўляецца неабходным вылучыць асноўныя напрамкі культурна-асветніцкай дзейнасці "Нашай нівы" ў 1906–1915 гг, бо менавіта праз іх можна было ажыццяўляць рэдакцыйную палітыку ў тых гістарычных умовах, у якіх выдавалася газета.

Выдаўцы газеты паставілі перад сабой смелыя па тым часе задачы: змагацца за легітымізацыю і адраджэнне роднай мовы; стварэнне нацыянальнай школы; згуртаванне вакол ідэі нацыянальнага адраджэння інтэлігенцыі; абуджэнне і ўключэнне ў нацыянальны рух асноўнага носьбіта беларускай мовы – сялянства.

У рэалізацыі пастаўленых задач газета сутыкнулася з вялікімі цяжкасцямі, для пераадолення якіх выдаўцам прыходзілася прыкладваць значныя намаганні. Па-першае, гэта цэнзурныя і ідэалагічныя перашкоды, якія чынілі ўлады, па – другое, раз'яднанасць беларускага насельніцтва па веравызнанні на католікаў і праваслаўных: першым у касцёле мэтанакіравана даводзілі, што яны палякі, а другім у царкве, што яны рускія, а тым і другім разам, што іх "мужыцкая" мова наогул не мае права на існаванне і з'яўляецца нейкім недарэчным "дыялектам". Не выпадкова, што першапачаткова газета выдавалася ў дзвюх транскрыпцыях: лацінскай і кірылічнай. Па - трэцяе, рэдакцыя пастаянна адчувала фінансавы голад, не мела сродкаў, каб разгарнуць у поўную моц сваю прапагандысцкую і асветніцкую дзейнасць, што было абумоўлена адноснай эканамічнай слабасцю беларускай нацыянальнай буржуазіі, якая і павінна была б стаць на чале нацыянальнага руху. Тыя, хто меў сродкі і мог бы дапамагчы газеце, у большасці не лічылі сябе беларусамі, "паркалёвая" інтэлігенцыя і сялянства, якія як маглі падтрымлівалі газету, проста не мелі грошай, каб фінансава падтрымаць распачаты газетай курс.

Тым не менш, рэдакцыя газеты зрабіла ўсё магчымае, каб рэалізаваць пастаўленыя задачы. Ва ўмовах палітычнай рэакцыі яна не магла адкрыта выступаць супраць вялікадзяржаўнай палітыкі царызму ў Беларусі і засяродзіла сваю ўвагу на паслядоўным ажыццяўленні культурна- асветніцкай дзейнасці.

Першым і галоўным напрамкам культурна-асветніцкай дзейнасці газеты з'яўляецца барацьба за стварэнне нацыянальнай школы. Царскі ўрад не прызнаваў існаванне беларускага народа і яго права на навучанне на роднай мове, у адрозненне ад іншых народаў Расіі, якім у час рэвалюцыі была дадзена магчымасць навучацца на роднай мове, хаця б і ў пачатковай школе. Нягледзячы на гэта, ідэя аб заснаванні беларускіх школ, выказаная газетай атрымала падтрымку сярод пэўнай часткі беларускага грамадства і такія паўлегальныя прыватныя і нядзельныя школы з'яўляюцца ў розных кутках Беларусі, сведчаннем чаго з'яўляюцца матэрыялы публікацый у газеце.

Другім, не менш важным напрамкам у культурна-асветніцкай дзейнасці газеты, з'яўляецца стварэнне народных бібліятэк і хат-чытальняў, якія, па сведчанні газеты, адчыняліся па ініцыятыве інтэлігенцыі пры народных школах у вёсках і фальварках. У іх чытачы побач з рускамоўнай літаратурай маглі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

знаёміцца з беларускімі перыядычнымі выданнямі і нешматлікімі тады беларускімі кнігамі.

Трэці напрамак – гэта стварэнне беларускіх культурна-асветніцкіх суполак і таварыстваў, якія пачалі ўзнікаць сярод беларускага студэнцтва і інтэлігенцыі ў Пецярбургу, Маскве, на Украіне, ў Прыбалтыцы і ў навучальных установах на тэрыторыі Беларусі. Спробы стварэння такіх таварыстваў прасочваюцца таксама па матэрыялах газеты ў павятовых гарадах, мястэчках, асобных вёсках і фальварках. Члены гэтых таварыстваў не толькі падтрымлівалі з газетай перапіску, праводзілі яе ідэі на месцах, але і фінансава дапамагалі ёй.

Чацвёрты, не меньш важны напрамак культурна-асветніцкай дзейнасці газеты "Наша ніва", – гэта пашырэнне беларускага кнігадрукавання. Газета імкнулася расказаць чытачу аб усіх выданнях, якія паяўляліся на беларускай мове, друкаваць урыўкі з іх, каб зацікавіць чытачоў ў іх набыцці. Яна шукала і знаходзіла магчымасці пашыраць сваю ўласную выдавецкую дзейнасць. Намаганнямі рэдакцыі пачалі выдавацца часопісы: для моладзі – "Лучынка" і для сялян – "Саха". Па ініцыятыве рэдкалегіі газеты ў Вільні пачаў выдавацца "Беларускі каляндар".

Безумоўна, шматгранная культурна-асветніцкая і грамадская дзейнасць газеты не абмяжоўвалася пералічанымі вышэй напрамкамі. Само выданне газеты стала важнейшай з'явай у гісторыі беларускай культуры, якая ў многім перадвызначыла яе развіццё ў пачатку XX стагоддзя. Больш таго "Наша ніва" становіцца цэнтрам, вакол якога аб'ядналіся ўсе нацыянальна свядомыя сілы беларускага грамадства, намаганнямі якіх ажыццяўлялася адраджэнне беларускай мовы і культуры і фарміравалася ўсведамленне беларусаў як самастойнай нацыі з багатай шматвякавой гісторыяй.

### *Літаратура*


1. Біч М. В. Беларускае адраджэнне ў XIX – пачатку XX ст. Мн., 1993.
2. Лыч Л. Беларуская нацыя і мова. Літ.-гіст. артыкулы. Мн., 1994.
3. Ліндпер Р.Гісторыкі і ўлада: нацыя, творчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX стст. СПб., 2003.
4. Смалянчук А.Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. СПб., 2004.
5. Гістарычны выбар на пачатку XX ст. // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мн., 2000. С. 91–100.
6. Сідарэвіч А. Луцкевічы і Луцэвіч. Мн., 2003.
7. Унучак А. У. "Наша ніва"і беларускі нацыянальны рух (1906–1915) / Дысертацыя на суісканне вуч. ступ.кандыдата навук. Мн., 2005.